Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 7 (28117) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Утаймаваць імклівы мяч**

СТАР. 3



**Тры гімны Янкі Сіпакова**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Сітуацыя з выпадзеннем ападкаў падчас праходжання цыклону па тэрыторыі краіны ўнесла пэўныя карэктывы ў работу сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва. Мы звяртаемся да ўсіх грамадзян, мінчан перш за ўсё, з просьбай узяць у рукі лапаты, выйсці і пачысціць вакол свайго транспартнага сродку, тэрыторыю ля дома. Сярод буйных беларускіх гарадоў больш за ўсё ападкаў выпала ў Мінску. На ўборцы снегу ў сталіцы задзейнічана больш за 400 адзінак транспарту, праца ідзе ў кругласутачным рэжыме. Асноўныя магістралі ўжо расчышчаны, яны функцыянуюць. Другарадныя дарогі таксама. Але прыдамавыя тэрыторыі, тратуары яшчэ патрабуюць адпаведнай працы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.01.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 19514,00 ▲ |
| Еўра | 21197,00 ▲ |
| Рас. руб. | 254,58 ▲ |
| Укр. грыўня | 815,21 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ІШЛІ «ЦАРЫ» З ПАХОДНЯМІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Напярэдадні старога Новага года, калі па праваслаўным звычаі адзначаецца самае вясёлае свята Каляд — Шчадрэц, у вёсцы Семежава Капыльскага раёна адбыўся традыцыйны «паход цароў». «Калядныя цары» — адзіны ў нашай краіне народны абрад, уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.**

СТАР. 4

■ Грошы

# 20 МІЛЬЁНАЎ — КУХАРУ, 55 — ДЫРЭКТАРУ

## Каму ў нас плацяць тысячу долараў і больш?

**Пра вялікі попыт на праграмістаў і іх добрыя заробкі мы чулі ўжо шмат разоў. Але ж не ўсім быць айцішнікамі. Хочацца верыць, што годныя прапановы ёсць для розных прафесій. Мы прааналізавалі вакансіі на нашым рынку працы і патрабаванні да кандыдатаў. Канстатуем: месцаў за тысячу долараў мала, але, калі вы маеце вопыт і валодаеце замежнай мовай, зможаце іх заняць.**

### ЛЕПШ БЫ Ў ЛЁТЧЫКІ ПАЙШОЎ...

У якой галіне больш шанцаў на высокі заробак? Згодна з інфармацыяй Нацыянальнага статыстычнага камітэта, лепш за ўсё аплачваецца праца ў сферы паветранага транспарту. Сярэднямесячны прыбытак спецыялістаў там — 16 мільёнаў рублёў. Добра атрымліваюць і ў асобных галінах прамысловасці. Тыя, хто заняты на вытворчасці коксу, нафтапрадуктаў і ядзерных матэрыялаў, маюць у сярэднім па 12,8 мільёна, на хімічнай вытворчасці і здабычы паліўна-энергетычных карысных выкапняў плацяць па 11,9 мільёна.

Нядрэнны прыбытак абяцае праца, звязаная з фінансамі і нерухомасцю. Так, фінансавы пасярэднік зарабляе 11,5 мільёна ў месяц, а агент па нерухомасці — 10,5.



Фота Надзеі БУЖАН.

Эксперты адзначаюць: высокія заробкі часцей за ўсё прапануюць прадстаўніцтвы вядомых замежных фірм. Або айчынныя буйныя пасяховыя кампаніі. Па рэйтынгу, складзеным Міністэрствам фінансаў, найбольш прыбытковай ААТ з'яўляецца «Беларуськалій». У тройцы таксама «Газпрам трансгаз» і Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. У дзясятцы патэнцыйна перспектыўных месцаў працы сярод іншых апынуліся Банк развіцця, прадпрыемства «Пеленг», якое займаецца оптыка-электронным прыборабудаваннем, Пінскі камбінат хлебапрадуктаў.

Калі глядзець па прапановах, то, сапраўды, шмат залежыць ад наймальніка. Асобныя кампаніі нават кладаўшчыку гатовы выдаваць па 30 мільёнаў у месяц.

### ТРАЦІНА ПРЫВАБНЫХ ВАКАНСІЙ — ДЫРЭКТАРСКІЯ

— Сёння, з прычыны крызісу, заробкі, натуральна, крыху ўпалі і вакансій, дзе прапаноўваецца больш за тысячу долараў, не так шмат, — кажа **дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Квадрат» Святлана КАРАСЦЯЛЁВА.** — Столькі плацяць, напрыклад, за месцы ўсіх узроўняў і тыпаў дырэктараў: генеральны, выканаўчы, камерцыйны, тэхнічны, па вытворчасці, па маркетынгу, па персанале.

СТАР. 4

# Зацверджаны склад Савета Бяспекі

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 13 студзеня Указам № 7 зацвердзіў склад Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Старшынёй Савета Бяспекі з'яўляецца Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

У складзе Савета Бяспекі — прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Вярхоўнага суда Валянцін Сукала, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Косінец, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Станіслаў Зась, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід Анфімаў, генеральны пракурор Аляксандр Канюк, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур, міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч, міністр замежных спраў Уладзімір Макей, міністр абароны Андрэй Раўкоў, міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка, старшыня Следчага камітэта Іван Наскевіч, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык, старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Сяргей Гурулёў, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леанід Мальцаў, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Алег Белаконеў, памочнік Прэзідэнта Беларусі па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка.

## ■ Парламенцкі дзённік

# САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА ВА ЎМОВАХ КРЫЗІСУ

### Гэтай тэме будзе прысвечаны ІІІ форум рэгіёнаў

**Рэгіёны Беларусі і Расіі павінны пастаянна падтрымліваць кантакты, і адной-дзвюх сустрэч для гэтага недастаткова. Менавіта з гэтай мэтай і быў распрацаваны праект форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі — сёлетні стане ўжо трэцім. Як заўважыў падчас пасяджэння арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні форуму Анатоль Русецкі, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, няма нічога пастаяннага, прыходзяць новыя людзі, ствараюцца новыя прадпрыемствы. Станоўчы вынік будзе толькі тады, калі сустрэчы будуць рэгулярнымі.**

— І для Беларусі, і для Расіі вельмі важна праводзіць такія форумы, — упэўнены парламентарый. — Гэта дзяржаўныя мерапрыемствы, якія маюць не толькі палітычны, але і эканамічны складнік. На другім форуме было падпісана дастаткова шмат буйных кантрактаў на суму больш як 230 мільёнаў долараў.

Як нагадаў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, бакі ўжо ўзгаднілі папярэднюю дату правядзення ІІІ форуму рэгіёнаў — 8-9 чэрвеня. Тэма яго была вызначана яшчэ ў Сочы — яна будзе прысвечана гуманітарным і сацыяльным пытанням.

— Вельмі важна, што гэты год кіраўнік дзяржавы аб'явіў Годам культуры, — заявіў Анатоль Русецкі. — Гэта цалкам супадае з тымі планамі, якія ў нас былі вызначаны па правядзенні форуму.

Па інфармацыі намесніка старшыні верхняй палаты парламента, мерапрыемства будзе праходзіць два дні. Плануецца правядзенне секцыйных пасяджэнняў па пытаннях культуры, навукі, адукацыі, маладзёжнай палітыкі. Падчас правядзення форуму запланаваны шэраг спадарожных мерапрыемстваў. Ці не самае значнае з іх — выстава «Белагра».

— У нашай краіны добрыя поспехі ў пытаннях сацыяльнай палітыкі ў вёсцы, — лічыць парламентарый. — Мы хацелі б асобна іх паказаць, абмеркаваць з нашымі калегамі з Расійскай Федэрацыі. Асобна будзе праведзены форум рэгіянальных СМІ, спартакіяда Саюзнай дзяржавы.

У рамках форуму будзе праводзіцца шэраг «круглых сталоў», канферэнцый. 9 чэрвеня пройдзе пленарнае пасяджэнне, на якім выступяць вядучыя навукоўцы, парламентарыі з дакладамі па пытаннях сацыяльнай, культурнай палітыкі, гуманітарнага супрацоўніцтва.

На думку Анатоля Русецкага, падчас форуму мэтазгодна абмеркаваць распрацоўку новай праграмы Саюзнай дзяржавы — у галіне імпартазамяшчэння. Нягледзячы на тое, што форум будзе прысвечаны сацыяльным і гуманітарным пытанням, на думку арганізатараў, абавязкова павінен быць канкрэтны складнік, якім і стане абмеркаванне саюзнай праграмы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

# ГРАНІЦА — ГЭТА ЭКАНОМІКА



### Учора адбылася нарада, прысвечаная зацвярджэнню рашэння на ахову дзяржаўнай мяжы

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы органамі пагранічнай службы ў 2016 годзе, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

### НАС ГЭТА ДАТЫЧЫЦЦА

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на сучасных выкліках і пагрозах, у тым ліку на міграцыйным крызісе ў Еўропе. «Мы цяпер глядзім на тое, як захлынулася Еўропа ад патоку мігрантаў — багатая, арганізаваная, здавалася б, Еўропа. Але мы не павінны складваць рукі сядзець і думаць, што нас гэта не датычыцца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што ў Беларусі такая сітуацыя немагчыма. Аднак трэба працаваць, захоўваючы дзейную палітыку адносна мігрантаў. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у Беларусі не супраць павелічэння іх патоку, але кожнага чалавека, які прэтэндуе на тое, каб жыць у краіне, будуць разглядаць, вобразна кажучы, пад павелічальным шклом.

«Мы транзітная дзяржава, і калі мы гэтыя працэсы ўпусцім, як гэта зрабіла Еўропа, мы захлiпнёмся потым ад злачыннасці, якую сюды прыўнясуць мігранты. Таму мы павінны праводзіць палітыку, якую праводзілі раней», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама выступіў рэзка супраць наяўнасці ў краіне баевікоў, якія ваявалі на Украіне з таго або іншага боку, і запатрабаваў у сілавікоў неадкладна разабрацца ў сітуацыі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яму вядома, што «некаторыя так званыя смелыя людзі, баевікі, якія ваявалі ў Данбасе, пазіруюць ужо ў Мінску са зброяй». Стаўленне Беларусі да такіх людзей, якія ваявалі на Украіне з таго або іншага боку, вядома, падкрэсліў Прэзідэнт. Звяртаючыся да прысутных на нарадзе, Аляксандр Лукашэнка даручыў: «Разбярыцеся імгненна разам з міліцыяй і КДБ».

«Ніякіх пазёраў, ніякіх баевікоў у краіне быць не павінна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

### ПРЫЯРЫТЭТ — ЭКАНАМІЧНЫЯ ІНТАРЭСЫ

Прэзідэнт даручыў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандру Косінцу стварыць групу незалежных спецыялістаў, якія вывучаць, ці ўсё зроблена па даручэннях кіраўніка дзяржавы па ахове эканамічных інтарэсаў на граніцы. Прэзідэнт растлумачыў, што размова ідзе аб пошлінах, дазволах, тарыфным і нетарыфным рэгуляванні. Гэта неабходна для таго, каб абараніць унутраны рынак.

У Беларусі заўсёды ўдзялялася самая пільная ўвага пытанням аховы дзяржаўнай граніцы і пагранічнай бяспекі ў цэлым, а тым больш цяпер. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў удзельнікаў нарады, што сёння ў гэтай тэме яго больш хвалюе эканамічны аспект. «Граніца — гэта не толькі бяспека, гэта вялікая эканоміка. Гэта падаткі, дзяржаўны бюджэт», — адзначыў Прэзідэнт. Таму на нараду разам з ваеннымі запрошаны і прадстаўнікі грамадзянскай часткі Савета бяспекі.

Прэзідэнт выказаў занепакоенасць тым, што спажывецкі рынак у Беларусі наводнены імпартнымі таварамі. «Народ павінен разумець, што імпартныя шмоткі — гэта не толькі вялікія грошы з іх кішэні, але і адсутнасць работы ў сябе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт перакананы, што для вырашэння гэтай праблемы трэба актывізаваць уласную прамысловасць, каб яна выходзіла на адпаведны ўзровень. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што айчынныя тавары павінны і могуць быць не горшымі за імпартныя і таннейшымі.

Аляксандр Лукашэнка рэзюмаваў, што абарона эканамічных інтарэсаў Беларусі на дзяржграніцы — вельмі сур'ёзнае пытанне. Ён адзначыў, што ў сувязі са змяненнямі правіл гандлю паміж Украінай, ЕС і Расіяй «мы зноў апынуліся паміж молатам і кавадлам, паміж двума буйнымі эканамічнымі ігракамі».

«Зразумела, што гэта будзе ўплываць на нашу знешнеэканамічную дзейнасць, таму неабходна пастаянна трымаць у полі зроку ўсе аспекты і праблемы гэтай сферы. І ўраду трэба ў тым ліку публічна вызначыцца тут. Мы павінны выканаць свае абавязацельствы ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза перад Расійскай Федэрацыяй», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь не мае намеру закрывацца ад Украіны, паколькі гэта прывядзе да страт тавараабароту ў памеры $5-6 млрд. Урэшце, расійскі бок гэтага ніколі і не прасіў, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «Але Расія хоча, і так правільна, каб гэты працэс быў празрыстым», — дадаў Прэзідэнт. Расійскаму боку было прапанавана вызначыць напрамкі, па якіх Беларусь будзе прапускаць транзітам прадукцыю з Украіны ў трэція краіны, што і было зроблена.

Кіраўнік дзяржавы расказаў таксама, што Беларусь можа перапрацоўваць украінскую прадукцыю, якая паступае, і потым пастаўляць ужо ў Расію. «Гэта не забаронена, мы з Расіяй так і дамовіліся. Калі гэта беларускі тавар — мы пастаўляем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

### ГАНДЛЯВАЦЬ ТРЭБА ПРАЗРЫСТА

Кіраўнік дзяржавы пракаментаваў нагнятанне сітуацыі вакол індывідуальных прадпрымальнікаў у сувязі з тым, што «з 1 студзеня скончыліся іх мядовыя гады і трэба працаваць у роўных умовах, па адпаведных дакументах».

«Ім трэба разумець, што сертыфікацыя прадукцыі, на якую мы пайшлі, — гэта першы крок. Ёсць тавар — усе суправаджальныя дакументы павінны быць. Мы павінны празрыста гандляваць, і хопіць вакол гэтага нейкія падкопы рабіць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У мінулым годзе Прэзідэнт сустракаўся з індывідуальнымі прадпрымальнікамі. І тады было прынята рашэнне, што з 1 студзеня 2016 года ўсе індывідуальныя прадпрымальнікі — плацельшчыкі адзінага падатку павінны будуць мець на тавары леграма дакументы, якія пацвярджаюць іх набыццё. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб дасягнутых у час той сустрэчы дамоўленасцях і выказаў недаўменне, што цяпер яго падштурхоўваюць да нейкіх рашэнняў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў пунктах пропуску на беларускай граніцы, безумоўна, трэба пазбаўляцца ад чэргаў, трэба таксама аблягчаць пагранічныя працэдуры. «Але ўсе рашэнні па спрошчаным парадку дзеянняў павінны рэалізоўвацца выключна на аснове захавання нацыянальных інтарэсаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У час нарады Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што санкцыйнымі і рэжымнымі мерамі неабходна наводзіць парадак на прыгранічнай тэрыторыі. «На ёй не павінна быць ніякага свавольства і бескантрольнасці», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка лічыць, што да аховы дзяржграніцы можна і трэба актыўней прыцягваць мясцовае насельніцтва.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка спыніўся на тэме ўладкавання граніцы інжынернымі збудаваннямі. Паводле яго слоў, гэта павінна быць зроблена па апошнім слове тэхнікі з улікам савецкага вопыту.

## ■ Пляцоўка для дыялогу

# ВОЛЬНАЯ СОТНЯ

### На першым у гэтым годзе пасяджэнні кантактнай групы па Украіне дамовіліся аб вызваленні палонных

Як паведаміла прэс-сакратар Леаніда Кучмы, прадстаўніка Украіны на перамовах, Дар'я Оліфер, яе краіна падтрымлівае ініцыятыву прадстаўніка Расіі Барыса Грызлова аб аб'яўленні рэжыму цішыні, які павінен пачацца неадкладна. На думку ўкраінскага боку, без спынення агню немагчыма ні правядзенне размініравання, ні нармальнае рашэнне палітычных, гуманітарных і эканамічных пытанняў.

Асаблівая ўвага па сустрэчы кантактнай групы была нададзена, па інфармацыі Дар'і Оліфер, «пытанню вяртання ўкраінскіх грамадзян з палону». Усе бакі прыйшлі да ўзаемнай згоды неўзабаве вызваліць больш за 50 чалавек з абодвух бакоў, у першую чаргу, параненых, цяжка хворых і жанчын.

Сярод канкрэтных вынікаў пасяджэння прэс-сакратар Леаніда Кучмы адзначыла працу эканамічнай падгрупы. «На Данбасе працягваецца аднаўленне чыгуначнай інфраструктуры, а таксама сістэм электразабеспячэння, — паведаміла Дар'я Оліфер. — Акрамя таго, атрымалася знайсці механізм пагашэння запазычанасці за ваду перад украінскімі прадпрыемствамі ў асобных раёнах Луганскай вобласці. Важна адзначыць, што гэты механізм знойдзены ў адпаведнасці з украінскім заканадаўствам з улікам гарантый расійскага боку аб пагашэнні запазычанасці».

Напярэдадні сустрэчы трохбаковай кантактнай групы Леанід Кучма сустрэўся з прадстаўніком Расіі Барысам Грызловым. Нагадаем, Барыс Грызлоў быў прызначаны паўнамоцным прадстаўніком Расіі ў кантактнай групе ў канцы снежня. Леанід Кучма так пракаментаваў гэту падзею: «Маё меркаванне адносна яго прызначэння — гэта павышэнне ўзроўню прадстаўніцтва Расіі ў Трохбаковай кантактнай групе».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

## ■ Стыхія

# «СНЕЖНЫЯ КАНІКУЛЫ» СКОНЧЫЛІСЯ

**Міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў паставіў задачу аператыўна навесці парадак на тэрыторыі ўсіх устаноў адукацыі пасля снегападу і ліквідаваць праблемы па падвозе дзяцей у дашкольныя і агульныя сярэднія ўстановы адукацыі.**

Складаныя ўмовы надвор'я, выкліканыя моцным снегападам, прымушаюць прымаць тэрміновыя дадатковыя меры. У першую чаргу гэта тычыцца школ і дашкольных устаноў у вёсках і малых гарадах.

Найбольшы аб'ём працы па ўборцы тэрыторый і ліквідацыі пашкоджанняў, нанесеных цыклонам «Даніэла», — у Мінскай вобласці, дзе 12 і 13 студзеня не працавалі 40 устаноў адукацыі: заняткі ў іх былі перанесены на 16 студзеня. Аднак у суботу сіноптыкі зноў прагназуюць пагаршэнне ўмоў надвор'я і снегапады.

У галоўным адукацыйным ведамстве краіны нагадваюць, што рашэнне аб спыненні заняткаў прымаецца сумесна кіраўнікамі міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя і па надзвычайных сітуацыях. Але пры неспрыяльных умовах надвор'я (ураган, тэмпература атмасфернага паветра мінус 25 і ніжэй градусаў) мясцовымі органамі ўлады можа быць прынята рашэнне аб часовым прыпыненні адукацыйнага працэсу ў вучняў 1—4 класаў, а таксама і іншых класаў. Дашкольным установам у моцныя маразы рэкамендавана не праводзіць для выхаванцаў прагулак на свежым паветры.

Тэмпературны рэжым у розных рэгіёнах, нягледзячы на адносна невялікія памеры нашай краіны, можа адрозніваецца на 5—10 градусаў. Як канстатуюць сіноптыкі, вышыня снежнага покрыва ў асобных раёнах дасягае 32 см.

Па словах начальніка ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіны Казак, наступствы снежнай стыхіі ў вобласці ўжо ліквідаваны і ўсе ўстановы адукацыі Мінскай вобласці з 14 студзеня працуюць у звычайным рэжыме.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

БПС-СБЕРБАНК

**С 15.01.2016** ОАО «БПС-Сбербанк» прекращает заключение договоров на условиях срочного банковского депозита «Управляй» от 12.09.2011 №01-07/313.

В соответствии с условиями данного депозита, автоматическое переоформление на следующий срок прекращается **с 15.02.2016**.

На невостребованный депозит и причитающиеся по нему проценты после прекращения автоматического переоформления проценты начисляются по ставке текущих счетов физических лиц (0,1% годовых).

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».

■ Са святам, калегі!

# БЕЗ ПЯЦІ ХВІЛІН СТАГОДДЗЕ

## АДЗНАЧАЕ АДНА З НАЙСТАРЭЙШЫХ У КРАІНЕ ГАЗЕТ

**У гэты дзень, толькі 95 год таму, у свет выйшаў першы нумар «Белорусской деревни» — цяперашняй «Сельской газеты». Нягледзячы на сталы ўзрост і выпрабаванні часу, яна нязменна захоўвае сваю галоўную накіраванасць — асвятленне невычарпальнай тэмы зямлі і чалавечай працы на ёй. Сяргей МІХОВІЧ, галоўны рэдактар выдання, упэўнены, што кожны беларус у той ці іншай ступені мае сялянскія карані і, як ужо лічым мы, кожны зможа адшукаць у свежым нумары газеты цікавостку па сабе.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Да мінулай круглай даты «Сельской газеты» быў створаны інтэрнэт-музей выдання — своеасаблівы падарунак чытачам. Што чакаць у свята гэтым разам?***

— Нешта надзвычайнае мы не рыхтавалі. Спадзяёмся, што зробім гэта, калі будзем святкаваць стагоддзе. Час так хутка ляціць, што 95 гадоў мы разглядаем як прамежкавую дату. У любым выпадку, нашых чытачоў чакае святочны, юбілейны нумар газеты. Сапраўды, 15 студзеня 1921 года выйшаў першы. Таму гэты дзень лічыцца днём нараджэння выдання. Але ж яно рыхтавалася калектывам загадзя, на дзень раней. Таму 14 студзеня ў нас — пасяджэнне разам з нашымі кіраўнікамі, чытачамі, а таксама ветэранамі «Сельской газеты», якіх, дзякуй богу, у нас шмат — больш за 30 чалавек.

***— Ці жа вялікая шыльда з лічбай 95, што вісіць на ўваходзе ў рэдакцыю?***

— Да гэтага вісела іншая, прысвечаная выпуску 20 000 нумара, днямі толькі змянілі. Дарэчы, мы ўвялі ў газеце рубрыку з адпаведнай назвай — «95 год з чытачамі». Папрасілі добра вядомых у Беларусі людзей — чытачоў «Сельской газеты» — выказаць сваё меркаванне пра яе. Як правіла, гэта вядомыя аграрыі, кіраўнікі ў дзяржаўных установах ці на прадпрыемствах альбо простыя працаўнікі вёскі. Гэта рубрыка вядзецца апошнія некалькі месяцаў. А на чацвер прыпаў юбілейны нумар — 20 683 па ліку ўвогуле і чацвёрты ў гэтым годзе. Канешне, у яго не змаглі ўвайсці ўсе нашы пачуцці, уся гісторыя газеты, увесь пройдзены шлях. Але мы імкнуліся гэтага дасягнуць.

***— Рэдакцыйны калектыў газеты, што рыхтаваў нумар, які ён сёння?***

— Час абраў нас. Сённяшні калектыў, сённяшніх журналістаў «Сяльчанкі», як кажуць. І мы ганарымся тым, што менавіта на нас выпала гэта сур'ёзная дата. Мы стараемся прытрымлівацца тых традыцый, той журналістыкі, якую стварала да нас шмат пакаленняў журналістаў «Сельской газеты». Зараз на старонках нашага выдання можна пабачыць матэрыялы рубрыкі «Здзьмухаючы пыл часу». Мы гартаем падшыўку любой даўнасці — 20, 40, 60 гадоў таму, і згадваем, што друкавалася ў той час, пра каго расказвалі. І потым шукаем, як мы кажам, «свежы след»: ці тых герояў, што ўжо састарэлі і цяпер на заслужаным адпачынку, ці, калі іх ужо, на жаль, няма з намі, знаходзім нашчадкаў. Так расказваем пра вядомых жывёлаводаў, паляводаў, старшынь калгасаў, пра асаблівыя тэрыторыі Беларусі. Тым самым працягваем эстафету слаўных спраў, якія рабіліся да нас.

***— Ці шмат сярод вашага творчага калектыву моладзі?***

— Дзякуй богу, так. І заўжды яе рэдактару не хапае. Хоць не думаю, што толькі маладыя могуць ствараць газету. Трэба, каб быў сплаў і вопыту, і майстэрства, і жывасці. У нас працуюць журналісты ад 22 да 60 гадоў. У тым ліку і пяцікурснікі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Мы шукаем іх, запрашаем працаваць, пестуем, і, як кажуць па-вясковаму, гадуем. Некаторыя з іх сёння — нашы сталыя супрацоўнікі, хоць яшчэ нядаўна падпрацоўвалі на палову стаўкі, атрымліваючы вопыт не толькі сённяшняга пакалення журналістаў «Сельской газеты», але і ўсіх пакаленняў, што былі да нас.

Школа нашага выдання вельмі паказальная. Не хачу пакрыўдзіць іншых, бо ў кожнага яна, канешне, ёсць. І ў «Звязды», самай старэйшай у краіне, таксама. Але «Сельская газета», асабліва ў 1970—1990-я гады мінулага стагоддзя, вельмі многіх журналістаў выгадавала і паставіла на крыло. Зараз яны працуюць у розных выданнях, на тэлебачанні краіны. Я таксама прайшоў гэтую школу. І вельмі рады, што ў свой час трапіў сюды. Калі прыйшоў працаваць, галоўным рэдактарам быў Андрэй Данілавіч Колас. Ён стаў маім хросным бацькам у журналістыцы, прымаў у калектыў пасля інстытута. Тады я нават не марыў, што калісьці стану галоўным рэдактарам. І вельмі ўдзячны лёсу, што вось ужо сёмы год кірую газетай.

***— Сёння яна, дарэчы, не выглядае на свае 95 гадоў. Такая маладая і сучасная. І сайт у вас маецца. Як вы ставіцеся да таго, што ў газеты ёсць электронная версія?***

— Як рэдактару газеты мне гэта не надта падабаецца. Чаму? Гэта добра, што ёсць тыраж газеты, ёсць чытачы, якія набываюць ці выпісваюць папяровую версію. Гэта наша рэальная аснова даходу. Калі яшчэ многа чытачоў заходзяць на сайт і чытаюць нашы матэрыялы — выдатна. Такім чынам шырыцца чытацкая аўдыторыя. Але навошта набываць газету, калі вечарам са смартфона на сайце можна прачытаць артыкулы заўтрашняга нумара? Магчыма, гэта пазіцыя не вельмі сучасная, але так і ёсць. І ўсё ж такі мы рады, што і ў інтэрнэце нас таксама чытаюць.

***— Як вы лічыце, яшчэ адна значная вяха гісторыі выдання — уваходжанне ў медыяхолдынг «Советская Белоруссия» — пайшла на карысць выданню?***

— Стварэнне холдынгу было своечасовай мерай. Гэта дазволіла зрабіць аптымізацыйныя крокі па паляпшэнні штатнага складу, фінансавага стану. Мы зараз не адчуваем, што пагоршылі свае ўмовы, акурат наадварот. Цяпер у нас яшчэ больш вялікая сям'я. І выданне зараз болей трывала адчуе сябе на газетным рынку.

***— Ці змяніўся з таго моманту чытач «Сельской газеты»? Увогуле, які ён сёння?***

— Па-першае, наш чытач часцей за ўсё жыве не ў сталіцы, а далёка за межамі мінскай кальцавой аўтадарогі, у вёсцы ці пасёлку. Як правіла, гэта кіраўнікі ўпраўленняў сельскай гаспадаркі і харчавання раённых выканкамаў, студэнты аграрных універсітэтаў, спецыялісты, якія працуюць у сельскай гаспадарцы і разлічваюць на газету як на дапаможнік у сваёй справе. Гэта тыя, хто хоча дабіцца поспехаў на ніве, калі перафразаваць ранейшую назву нашай газеты, сельскай гаспадаркі.

Мы разумеем, што сённяшняму чытачу, гарадскому ці вясковаму, цяжка выпісваць некалькі газет адначасова. І грашовыя магчымасці не ўсім дазваляюць, і іншых крыніц інфармацыі хапае. Безумоўна, перш за ўсё мы імкнёмся даць у адной газеце тое, што тычыцца нашай тэматыкі, але не замыкаемся і ставім на паласу інфармацыю замежную, сацыяльную, культурную, спартыўную, крымінальную хроніку. Мы хочам, каб наш чытач меў выданне, у якім можна даведацца пра ўсё.

Спадзяёмся, што разам з нашымі чытачамі мы дойдзем да стагоддзя газеты і напоўніцу адсвяткуем яго. І што тыражы за гэты час павялічацца, газета стане яшчэ больш цікавай. Магчыма, рабіць і рэдагаваць яе будуць ужо іншыя людзі. Галоўнае, каб працягваліся традыцыі, каб газета, нягледзячы на свой сталы ўзрост, заставалася сучаснай і не па гадах маладой.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ З нагоды

# АБУЦЬ ГУМОВЫЯ БОТЫ

## і ісці здабываць журналісцкі досвед

**Такое пажаданне для маладых журналістаў было выказана на ўрачыстай канферэнцыі, прысвечанай 95-гадоваму юбілею «Сельской газеты», які адзначаецца сёння. І нездарма ў якасці пляцоўкі для «завастрэння пяра» рэкамендуюць менавіта гэтае выданне. Першая беларуская нобелеўская лаўрэатка Святлана Алексіевіч рабіла свае пачатковыя крокі ў прафесіі якраз тут, таму сумнявацца ў якасці журналісцкай школы «Сельской газеты» не даводзіцца.**

Больш за 20 тысяч выпускаў выдання, 3 дзясяткі супрацоўнікаў, удастоеных звання «Герой працы», больш за 390 камандзіровак на год, а таксама ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга — з такім «багажом» падышла газета да сёлетняга юбілею. Таму і адзначаюць яе заслугі — на самым высокім узроўні. **Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ** зачытаў вітальны ліст калектыву рэдакцыі газеты-юбіляркі ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

«Я хацеў бы падзякаваць вам за той пласт, які вы пераворваеце цягам стольких гадоў, — звярнуўся Ігар Бузоўскі да галоўнага рэдактара «Сельской газеты» Сяргея Міховіча. — Сельская гаспадарка — найцяжэйшая праца. Адышлі тыя людзі, якія маглі рэальна паказаць, як здабываецца кавалачак хлеба, таму ваша праца становіцца на вагу золата. Я шчыра ўдзячны, што вы захоўваеце найлепшыя традыцыі і дапамагаеце цаніць людзей працы».

Мяняліся назвы, журналісты, адрасы, аднак за 95-гадовую гісторыю выданне не здрадзіла сваёй ідэі — асвятляць моцныя сяла і цяжкую, але неабходную ўсім нам працу яго жыхароў.

Дарэчы, пра гісторыю. Менавіта на яе звярнуў увагу **галоўны рэдактар холдынга «Советская Белоруссия» Павел ЯКУБОВІЧ.**

«Па старонках «Сельской газеты» гісторыкі будуць вывучаць летапіс нашай краіны. Таму што ўсё, што адбывалася важнага, не толькі ў аграрным сектары, заўсёды знаходзіла адлюстраванне на старонках газеты», — зазначыў ён.

Павел Якубовіч дадаў, што заўсёды найлепшыя нарысісты — эліта журналістыкі — працавалі ў «Сельской газете». Ды і цяпер выданне не згубілася, па-ранейшаму выглядае цікавым, дзелавым, аднак пры гэтым не сухім, а творчым.

Падзяку калектыву рэдакцыі «Сельской газеты» за добрасумленную і плённую працу ў сродках масавай інфармацыі і значныя творчыя дасягненні, а таксама віншаванні з 95-годдзем даслала і міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч.

«Праца журналіста «Сельской газеты» няпростая, бо знайсці падыход да працаўніка, механізатара, жывёлавода складана. Таму я кожнаму маладому журналісту пажадаў бы абуць гумовыя боты, выехаць у поле і паглядзець, як працуюць нашы людзі ў вёсцы», — дадаў да сябе **першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.**

Ён зачытаў загад і ўзнагародзіў некаторых супрацоўнікаў выдання нагруднымі знакамі «Выдатнік друку Беларусі» і граматамі.

«Сам я з вёскі, бацька мой працаваў у калгасе. А першы мой запіс у працоўнай кніжцы — трактарыст калгаса «Перамога», — падзяліўся першы намеснік міністра.

На юбілейную імпрэзу запрасілі ветэранаў «Сельской газеты», многія з якіх аддалі выданню не адзін дзясятак гадоў жыцця. Старэйшыя журналісты атрымалі падарункі ад маладзейшых калег.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# ШАЎЦОЎ І КАМПАНІЯ

## Сёння стартуе чэмпіянат Еўропы па гандболе

**РАСКЛАД:**
**15 студзеня** *Харватыя — Беларусь (18.00)*
**17 студзеня** *Беларусь — Ісландыя (18.00)*
**19 студзеня** *Беларусь — Нарвегія (20.00)*
**Склады астатніх папярэдніх груп:**
**A** (Кракаў) — Францыя, Польшча, Македонія, Сербія; **З** (Вроцлаў) — Іспанія, Швецыя, Германія, Славенія; **D** (Гданьск) — Данія, Венгрыя, Расія, Чарнагорыя.

**Сёлета кантынентальнае першынство пройдзе ў Польшчы, яго прымуць чатыры гарады. Каманды разбітыя на чатыры квартэты, зборная Беларусі выступіць на групавым этапе ў Катавіцах на арэне «Сподэк», якая ўмяшчае адзінаццаць тысяч гледачоў. Сапернікамі дружыны Шаўцова стануць зборныя Ісландыі, Нарвегіі і Харватыі. Пасля першага этапу барацьбу за ўзнагароды працягнуць па тры найлепшыя каманды з кожнай групы.**

Перад адказным стартам беларускія гандбалісты правялі зборы і прынялі ўдзел у двух турнірах. Спачатку яны выступілі ў Латвіі на Кубку рыжскай думы, а затым на Калядным турніры ў Маскве. **Галоўны трэнер Юрый ШАЎЦОЎ** нягледзячы на розныя вынікі сустрэч, заклікаў не рабіць паспешлівых высноў і сказаў, што перад камандай зусім не стаяла задача абавязкова перамагаць у таварыскіх матчах. Адзначым, што канкрэтных задач на еўрапейскае першынство, рулявы гандбалістаў таксама не агучыў.

*— Зборная знаходзіцца ў рабочым стане. Пасля катарскага чэмпіянату свету мы абнавілі склад на 50 працэнтаў. Тым не менш паступова паляпшаем гульню. Калі ў Латвіі ў нас былі вялізныя праблемы, то ў Маскве саступілі аргенцінцам, згулялі ўнічыю з галандцамі і расіянамі, а маглі і перамагчы.*

*На чэмпіянаце Еўропы перад камандай канкрэтнай мэты не стаўлю. Наша галоўная задача — палепшыць уласную гульню. Рад бы сказаць, што да нас далучыліся Карабаціч і Хансэн і зараз мы фаварыты EURO. Але... Сёння наша каманда павінна здзейсніць подзвіг, каб выйсці з групы ў асноўны раўнд,* — распавёў Юрый Шаўцоў перад ад'ездам у Польшчу.

У выязным складзе няма вопытнага галкіпера Віталя Чарапеньскі, які яшчэ не змог аднавіцца пасля траўмы. Акрамя таго, з-за праблем са здароўем пад пытаннем і ўдзел у турніры лінейнага Арцёма Каралька. У цэлым жа склад сфарміраваны даволі роўны, як адзначыў **кіраўнік Федэрацыі гандбола Беларусі Уладзімір КАНАПЛЁЎ**, каманда цяперашняга ўзору — гэта «сплаў вопыту і маладосці».

*— Думаю, калі брэсцкія хлопцы згуляюць за зборную, як за БГК у Лізе чэмпіёнаў і СЕХА-лізе, а ўсе астатнія, як у матчы з расіянамі (Калядны турнір у Маскве), наша каманда будзе выглядаць годна. І зможа выканаць тыя задачы, якія мы зараз не агучваем, але якія сядзяць у нас у галаве. Я казаў хлопцам: пераглядзіце, як гуляла наша «маладзёжка» ў Бразіліі. Вось такая павінна быць самааддача ад першай да апошняй хвіліны. Лічу, тады вынік будзе дасягнуты,* — сказаў Уладзімір Мікалаевіч.

Пра тое ж падыход да кожнай гульні чэмпіянату заявіў і лідар зборнай, **капітан Сяргей РУТЭНКА.**

— Добрага выніку ў Польшчы мы дасягнем толькі ў тым выпадку, калі згуляем з поўнай выкладкай і максімальнай самааддачай. Ведаеце, можна атрымаць перамогу, што называецца, на адной назе — і застацца незадаволеным. А можна прайграць і сумлення сказаць сабе: мы змагаліся да канца. Дык вось, наша асноўная мэта — не адчуваць сораму перад сабой. Пры любых абставінах кожны гулец, пакідаючы пляцоўку, павінен шчыра сказаць нават не столькі партнёрам, колькі самому сабе: я зрабіў усё, што мог.

Нагадаем, беларускія гандбалісты чацвёрты раз будуць выступаць сярод наймацнейшых каманд Еўропы. У 1994 годзе пад кіраўніцтвам Спартака Мірановіча наша зборная заняла 8-е месца, а ў 2008-м у Нарвегіі спынілася на 15-й пазіцыі, у 2014-м стала 12-й.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*





# ІШЛІ «ЦАРЫ» З ПАХОДНЯМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Калядныя цары» праводзяцца з 1997 года, калі работнікі Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку пад кіраўніцтвам Таццяны Шауры адрадзілі незвычайную форму калядавання, якая бытавала на слуцкіх і капыльскіх землях яшчэ з XVIII стагоддзя. У 60-я і 70-я гады мінулага стагоддзя гэты абрад быў амаль забыты, але па ўспамінах старых семежаўцаў цалкам адноўлены. Са старых «цароў», якія хадзілі на пачатку «ўваскрашэння» тэатралізаванага шэсця, сёння засталіся адзінкі.

— Многія з першых «новых» «цароў» пасталелі, ажаніліся, пераехалі ў іншыя месцы, — кажа нязменны кіраўнік праекта «Семежаўскія «Калядныя цары» Таццяна Шаура. — Але, напрыклад, Кірыл Нячай, які працуе і жыве ў Салігорскім раёне, заўсёды прыязджае на свята і ўдзельнічае ў спектаклі «Цар Максімільян» у ролі самога Максімільяна.



Гэтым разам у ролях Мамая, «цароў» (а іх у калядным гурце сем), Бабы і Дзеда, Лекара, Механошы, Музыканта былі задзейнічаны Мікалай Стасевіч, Аляксандр Шацілін, Максім Глотаў, Андрэй Парчанаў, Аляксандр Парчанаў, Віктар Аралаў, Яўген Кухарэнка, Валянцін Садоўскі, Сяргей Кіеня, Іван Жук, Генадзь Кіслы. Семежаўскія «цары» — гэта працаўнікі мясцовай гаспадаркі.

У навагоднюю ноч «цары» абышлі дзве вуліцы, наведаўшы і дамы найстарэйшых жыхароў — Марыі Гаўрыловіч, Івана Леаненi, Міхаіла Курпана і яго ўнучкі Вольгі.

У Семежаве ўжо трэці год ходзяць «маладыя цары» — старшакласнікі мясцовай школы пераймаюць даўнейшую традыцыю.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

*Капыльскі раён.*
***Больш здымкаў — на zviazda.by***

# 20 МІЛЬЁНАЎ — КУХАРУ, 55 — ДЫРЭКТАРУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У Агульнарэспубліканскім банку вакансій ёсць каля 50 прапаноў з заробкам у тысячу долараў і вышэй (усяго 0,3 працэнта ад агульнай колькасці заяўленых свабодных месцаў). І амаль трацiна з іх — вакансіі дырэктараў. Патрабуецца, напрыклад, кіраўнік спартыўнага комплексу. Цана пытання — 25 мільёнаў. Але каб заняць гэта месца, вы мусіце напрацаваць вопыт у сферы аказання аздараўленчых і забаўляльных паслуг, не меншы за 10 гадоў, і ведаць англійскую, нямецкую і літоўскую мовы. Шукаюць дырэктара ў Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», кандыдату абяцаюць 40 мільёнаў. А за 55 мільёнаў можна ўзначаліць прыбалтыйскую інвестыцыйную кампанію. З неабходнага — вышэйшая будаўнічая ці інжынерная адукацыя, дзесяцігадовы вопыт і валоданне англійскай і літоўскай мовамі.

**Распаўсюджанае патрабаванне — веданне замежнай мовы. У 90 працэнтах гэта англійская. Яе ў прынцыпе дастаткова, каб заняць высокую пасаду практычна ў любой кампаніі.**

Вышэй за тысячу долараў аплачваецца праца галоўнага бухгалтара, маркетолага-аналітыка, менеджара па продажах. У апошніх спецыяльнасцяў фіксаваная частка заробка — у асноўным 30 працэнтаў ад агульнага прыбытку. Вялікая сума набягае за кошт працэнтаў. Таму на пазначаныя ў вакансіі мільёны могуць разлічваць толькі паспяховыя прадаўцы.

Шчодрыя прапановы ёсць і для інжынераў (асабліва для начальнікаў аддзелаў і кіраўнікоў праектаў). Так, спецыяліст патрэбен на Аршанскі авіярамонтны завод. Абяцаюць 20 мільёнаў у месяц. Ці можна паспрабаваць уладкавацца ў кампанію, якая пастаўляе абсталяванне для нафтагазавай галіны, ЖКГ, металургіі. Калі свабодна валодаеце польскай мовай і разбіраецеся ў польскай тэхніцы, месца за 54 мільёны ваша.

Па астатніх прафесіях высокааплатных прапаноў не так шмат. Але сустракаюцца. Шукаюць, напрыклад, кухара, які за 20 мільёнаў у месяц будзе радаваць гасцей установы рознымі прысмакамі. Праўда, для гэтай вакансіі неабходны пяцігадовы кандытарскі вопыт у Італіі і добрае веданне англійскай і італьянскай моў.

## ЧАСТА ЗВАЛЬНЯЕШСЯ? НЕНАДЗЕЙНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ

Знайсці прывабную вакансію, кажуць спецыялісты па кадрах, не праблема. Праблема — самому ёй адпавядаць. Якім мусіць быць кандыдат, каб прэтэндаваць на тысячу долараў у месяц і больш? Абавязкова — вышэйшая адукацыя. Пажадана атрыманая ў дзяржаўнай ВНУ ці добрым прыватным універсітэце, дыплом якога мае вагу на рынку працы. Неабходна таксама бізнес-адукацыя (атрымліваць яе варта адзін-два разы на год). Пастаяннае павышэнне кваліфікацыі павінна быць пацверджана сертыфікатамі бізнес-школ ці курсаў. У кадравых агенцтвах ведаюць, чаму якая школа вучыць, па якой методыцы. Каб праверыць, ці не хлусіць саіскальнік, пытаюцца ўсё, нават імя выкладчыка.

Распаўсюджанае патрабаванне — веданне замежнай мовы. У 90 працэнтах гэта англійская. Яе ў прынцыпе дастаткова, каб заняць высокую пасаду практычна ў любой кампаніі.

Акрамя пералічанага, павінен быць вопыт працы — мінімум тры гады на кожным месцы. Сёння большасць кандыдатаў часта мяняюць месцы, раз на год, на паўгода. Такія саіскальнікі першапачаткова не могуць прэтэндаваць на высокія заробатныя платы, паколькі ствараюць уражанне ненадзейных спецыялістаў. Наймальнік аддасць перавагу таму, хто працаваў больш стабільна. Натуральна патрэбен вопыт па той спецыяльнасці, на якую чалавек прэтэндуе. Нельга прыйсці з рознічнага гандлю на вытворчае прадпрыемства і заняць аналагічную пасаду.

— У нас па ўсіх гэтых крытэрыях вельмі мала людзей, — каментуе Святлана Карасцялёва. — Заўсёды штосьці не супадае. Да таго ж у кожнай вакансіі ёсць нейкае вузкае месца. У чалавека з шасці неабходных якасцяў будзе пяць — яго ўжо не возьмуць. Вядома, ёсць яшчэ шэраг іншых пажаданняў, якія не прапісваюцца ў аб'яве. Некаторыя арганізацыі, напрыклад, падбіраюць супрацоўнікаў па адпаведнасці карпаратыўнай культуры, дрэс-коду. Ці нельга, скажам, паліць у кампаніі. Шмат дробных дэталяў, якія працадаўца па сакрэце нам выкладае і якіх мы мусім па максімуме прытрымлівацца.

## ЧАМУ ПРЫВАБНЫЯ МЕСЦЫ ПУСТУЮЦЬ?

Чым вышэй заробак, тым складаней знайсці спецыяліста. З нядаўняга: замежная кампанія, якая займаецца алгарытмічным гандлем (гэта продаж акцый і каштоўных папер з выкарыстаннем камп'ютарных робатаў), адкрывала сваё прадстаўніцтва ў Мінску. Шукала для гэтага офіса дырэктара. Прапаноўвалі 10—12 тысяч долараў, але там былі шалёныя патрабаванні. Кандыдат мусіў свабодна валодаць замежнай мовай, мець адукацыю і вопыт працы на стыку дырэктара айці-кампаніі і фірмы, якая займаецца фінансамі. Неабходна было ведаць, як пішацца алгарытм, па якім вылічваецца найбольш аптымальны і высокапрыбытковы продаж акцый. Ахвотных была вялікая колькасць, але некаторыя не маглі зразумець, што ад іх патрабуецца. У выніку на пасаду запрасілі еўрапейца (на Захадзе гэта галіна больш вядомая).

Высокааплатныя вакансіі, асабліва на месцы дырэктараў, пустуюць і з іншых прычын. Саіскальнікі з добрай кваліфікацыяй ацэньваюць сваю працу значна вышэй, чым гатовы плаціць наймальнік. Фінансаваму дырэктару з веданнем англійскай мовы прапаноўваюць, напрыклад, заробак у раёне дзвюх тысяч долараў, а кандыдаты менш за тры з паловай не разглядаюць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ■ Факт

### Запрашаюць «лясныя сталовыя»

**Работнікі паляўнічых гаспадарак Мінлясгаса арганізавалі падкормку дзікіх звяроў і птушак.**

Штогод для гэтых мэт гаспадаркі нарыхтоўваюць розныя віды кармоў. У асноўным гэта зернеадходы, гароднiна, сена. Нарыхтаванае захоўваецца ў спецыяльных кармасховішчах, абсталяваных пры кожнай лесапаляўнічай гаспадарцы.

Кармушкі ці падкормачныя пляцоўкі для жывёл, раўнамерна размешчаны на тэрыторыі паляўнічых гаспадарак. Усе біятэхнічныя збудаванні рыхтуюцца да пачатку падкормачнага перыяду, каб не адпужваць жывёл. Калі ў звяроў узнікаюць праблемы са здабычай корму, яны з лёгкасцю знаходзяць такія кармушкі.

### Памахаем лапкамі старому Новаму году

**Больш за 143 тысячы елак рэалізавалі арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі за навагоднія святы.**

Лідарам па продажах стала Мінская вобласць, дзе сваіх пакупнікоў знайшлі амаль 40 тысяч галоўных атрыбутаў зімовых свят. Паранейшаму ў пакупнікоў карысталіся попытам і букеты з сасновых і яловых лапак. За навагодні сезон іх было прададзена амаль 4 тысячы штук. Было рэалізавана таксама каля тысячы навагодніх дрэў у кадушках.

### Выратавалі Снягурку ў «Лексусе»

**Супрацоўнікі ДАІ Цэнтральнага раёна Міхаіл Бізунок і Эдуард Русіновіч, праязджаючы па знешнім кальцы МКАД у бок праспекта Пераможцаў, убачылі аўтамабіль «Лексус», які з'ехаў у кювет.**

За рулём машыны знаходзілася дзяўчына ў касцюме Снягуркі. На шчасце, кіроўца не пацярпела, чаго не скажаш пра яе транспартны сродак, паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. Каля гадзіны супрацоўнікі ДАІ спрабавалі выцягнуць аўтамабіль, аднак намаганні плёну не далі. Давялося спыніць грузавік і звярнуцца да яго кіроўцы па дапамогу. Сумеснымі высілкамі Снягурку выцягнулі са снежнага палону.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*



## Віялета САКАЛОВІЧ:

# «І ПАЛОХАЕМ, І ПАВУЧАЕМ, І... ЗАБАЎЛЯЕМ»



Фота Ганны ІВАНОВАЙ.

**Самая аўтарытэтная праграма крымінальнай хронікі на Беларускім тэлебачанні мінулай восенню адзначыла свой 15-гадовы юбілей. Журналісцкая каманда «Зоны Х» — гэта прафесіяналы, якія знаходзяць цікавыя факты, доказы і даюць многім гледачам глебу для роздумаў. Як прыклад, у новым годзе яны ўжо падрыхтавалі цікавы праект «Закон і парадак» — пра дзейнасць Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. Пасля прагляду першай серыі мы сустрэліся з яго аўтарам і куратарам Віялетай САКАЛОВІЧ (яна таксама ўзначальвае аддзел крымінальных навін АТН і з'яўляецца кіраўніком праграмы «Зона Х»), каб пагаварыць пра рэйтынгі, прафесійнае выгаранне і стэрэатыпы.**

***— У панядзелак была прэм'ера новага праекта АТН «Закон і парадак». Ці задаволены сваім стартам?***

— Наколькі ўдала мы стартавалі, трэба спытаць у тых, хто нас паглядзеў. Бо я, як аўтар і кіраўнік праекта, і нават як глядач, вельмі патрабавальная да сябе. Мне заўсёды здаецца, што можна зрабіць лепш. Спадзяюся, што зробленае спадабалася не толькі нам, але і калегам з МУС, з якімі мы супрацоўнічалі. Але галоўнае, каб глядач ацаніў, бо мы заўсёды працуем у першую чаргу для яго.

Наперадзе нас чакае яшчэ 7 серый, дзе будуць асвятляцца актуальныя тэмы розных кірункаў, пачынаючы ад грамадскай бяспекі, дзіцячай злачыннасці і заканчваючы зладзеямі «ў законе» (гэтай тэме будзе прысвечана дзве серыі), кіберзлачыннасцю і іншымі. Апошні выпуск у эфіры з'явіцца ў Дзень міліцыі, але нам яшчэ шмат пра што ёсць расказаць, і я была б не супраць працягу.

***— У першай серыі сучаснасць перамяжоўваецца з дакументальнымі ўстаўкамі, што стварае пэўны кантраст і надае мастацкі акцэнт аповеду. Яшчэ якіх «фішак» варта чакаць?***

— Мы імкнуліся ў пэўным сэнсе правесці паралелі: з чым сутыкалася міліцыя, умоўна кажучы, 20—30 гадоў таму, і што адбываецца сёння. Бо злачынствы былі заўсёды, але цяпер адбылася іх пэўная адаптацыя да сучаснасці. І мы стараліся выбіраць найбольш цікавыя выпадкі, якія засталіся не толькі ў памяці грамадства, але і ва ўспамінах міліцыянераў, непасрэдных удзельнікаў раскрыцця таго альбо іншага злачынства. На жаль, не ўся відэа- і фотадакументацыя тых часоў захавалася, таму недзе мы рабілі рэканструкцыю, абапіраючыся на хроніку часу. Разам з тым мы шукалі арыгінальныя падыходы, каб у гледача не было жадання параўноўваць наш праект з аналагамі ў гэтай тэматыцы.

***— Падчас працы над праектам можна было прасачыць, якія прычыны штурхаюць людзей аступацца ў жыцці?***

— Зразумець прычыны ў кожным выпадку не проста. Часцей за ўсё на злачынствы людзей цягне прага нажывы, часам не апошнюю ролю тут адыгрываюць жанчыны... Калі шчыра, то мы не задаваліся мэтай шукаць прычыны, аднак зразумела, што ў працэсе ўзнікаюць і прысутнічаюць назіранні, нейкія высновы. Але перш ты імкнешся зразумець, як усё адбылося.

***— А калі мы гаворым пра дзіцячую злачыннасць — тут што трэба мець на ўвазе?***

— Тут усё значна больш складана, перш за ўсё з пункту гледжання псіхалогіі. І мы паспрабавалі расказаць, якімі шляхамі некаторыя дзеці імкнуцца заняць сваю нішу ў грамадстве, адаптавацца ў жыцці. Бывае ж, што не аказваецца побач бацькоў ці старэйшых таварышаў, здольных падказаць, што для дасягнення нейкай сваёй мэты не варта крыўдзіць іншага чалавека. Многія з тых, пра каго мы будзем расказваць, — дзеці з нядобранадзейных сямей. Яны не мелі нагляднага прыкладу, каб зразумець: усё можа складвацца па-іншаму. І справа нават не ў тым, ці чыталі яны кніжкі пра «што ёсць добра, а што дрэнна». Прычына ў сумным вопыце, калі малыя бачылі бацькоў, якія пілі, у іх адсутнічалі нармальныя ўмовы для жыцця. Якраз там спрацоўвала правіла: хто мацнейшы, той і мае рацыю. А ўжо пазней, учыніўшы злачынства, яны разумелі: калі б быў шанц, то зрабілі б іншы выбар. Альбо ёсць прыклады тых, хто аступіўся, але не дайшоў да крайнасці. Прайшоўшы інспекцыю па справах непаўналетніх, вучылішча закрытага тыпу, яны вынеслі павучальны ўрок з мінулага і стварылі нармальныя сем'і.

**«Сёння з парашутам я ўжо не скочыла б. А вось ад кругасветнай вандроўкі пад парусам, магчыма, не адмоўлюся».**

***— Мінулай восенню свой юбілей адзначыла праграма «Зона Х». Чаму яна не страчвае папулярнасці ў гледача?***

— Людзям характэрна жаданне «хлеба і відовішчаў». Я не магу сказаць, быццам наш праект, распавядаючы пра злачынствы, надзвычайныя сітуацыі, нясе негатыў. Я не стамлюся паўтараць: «Зона Х» працуе на прафілактыку. І ў кожным эфіры мы нагадваем, што за злачынствам непазбежна ідзе пакаранне. Яно можа быць самым розным: ад штрафу да турмы. Мы перыядычна робім матэрыялы з месцаў пазбаўлення волі, і кожны чалавек можа паглядзець, як жывуць там людзі. У іх ёсць праца, харчаванне, яны забяспечаны дахам над галавой, але разам з тым яны абмежаваныя ва ўсім. Таму важна не забываць, што здзейсненае злачынства заўсёды будзе пакарана. Так, праграма рэйтынгавая, бо людзей гэта прыцягвае. «Зона Х» таксама з'яўляецца адзінай аператыўнай крымінальнай праграмай на канале. У дзень у нас выходзіць два арыгінальныя эфіры і два паўторы. Калі казаць пра «знешнасць» праекта, то час ад часу стараемся мяняць напаўненне, форму падачы матэрыялаў. Увялі агляды пра здарэнні на дарогах і надзвычайныя сітуацыі па лініі МНС. У нас ёсць і «лайт», дзе мы імкнёмся не толькі напалохаць аўдыторыю і павучыць жыццю, але і пацешыць.

***— Прафесійнае выгаранне знаёмае вам?***

— Перыядычна такі стан узнікае. Калі разумееш, што твае рэсурсы амаль вычарпаны. Але дастаткова дзянёк адпачыць — і з новымі сіламі бярэшся за працу. Безумоўна, часам пры падрыхтоўцы матэрыялу ты разумееш, што пра гэта ўжо гаварыў, такі ход выкарыстоўваў, аднак важна помніць, што наша задача — зрабіць так, каб глядач затрымаўся ля экрана, каб праграма была ў «топе». І тады знаходзяцца і новыя словы, і падыходы. А пры жаданні разгрузіць мозг у нас ёсць магчымасць папрацаваць у іншых праектах. «Зона Х» уваходзіць у структуру Агенцтва тэленавін, а там, як мы ведаем, вялікая пляцоўка для творчасці. Мы, журналісты, рэпарцёры, — людзі ўніверсальныя і можам працаваць у любой нішы.

***— Вам даводзілася сутыкацца са стэрэатыпам, што жанчына і крымінальная тэматыка — рэчы не сумяшчальныя?***

— Яшчэ і бландзінка! Пэўныя стэрэатыпы і суб'ектыўныя погляды на гэты конт існуюць. Маўляў, дзяўчына, што яна можа?! А я лічу, тут адсутнічае гендарнае раздзяленне. Калі ты ўмееш працаваць, то зможаш зрабіць якасны сюжэт, праграму ў любой тэме.

***— Калі вы адчулі сябе прафесійна загартаванай?***

**15.40** Баявік «Каралі Дагтаўна».
**17.30** Фантастыка «2012».
**20.00** Прыгоды «Буйная рыба».
**22.10** Драма «Джо».
**0.10** Трылер «У нетрах кашмару».
**1.40** Мюзікл «Танцуй са мной».
**4.00** Меладрама «Жорсткія гульні».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Маша і мора».
**7.55** Маст. фільм «Вечары на хутары каля Дзіканькі».
**9.07** М/ф «Як злавіць пяро Жар-Птушкі».
**10.20** Драма «Кромаў».
**12.20** Меладрама «Федзька».
**13.50** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
**15.20** Камедыя «Ёлкі 1914».
**17.10** Камедыя «Вясёлая моладзь ;)».
**18.50** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
**20.20** Баявік «Васьмёрка».
**21.50** Драма «Экспірыенс».
**23.30** Трылер «Юлечка. Смяротныя ўрокі».
**1.20** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**3.10** Трылер «Здрада».
**5.05** Драма «Ахоўвай мяне, мой талісман».

### National Geographic

**6.00, 17.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.50** Гульні розуму.
**7.35, 13.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 11.40** Ледзяная дарога.
**8.45** Непакорлівы востраў.
**9.30, 14.10, 19.30** Незвычайныя здабычы.
**10.20, 14.50, 20.15** Тэхаскі ўлоў.
**11.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**12.35** Золата Юкана.
**15.40** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.25** Бабровая плаціна.
**18.00, 21.00, 0.45, 3.45** Інстынкт выжывання.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Сіла племені.
**22.30** Тайны старажытнасці.
**23.15** Паранармальнае.
**0.00, 2.15, 5.15** Расследаванні авіякатастроф.
**3.00** Дзень «Д».

### Discovery

**6.00, 10.30** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**6.50, 23.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**7.45, 12.20, 19.30** Як гэта ўстроена?
**8.10, 12.45, 19.00** Як гэта зроблена?
**8.40, 15.05** Гаражнае золата.
**9.35, 5.15** Выжыць разам.
**11.25, 4.25** Падарожжа да цэнтра Зямлі.
**13.15, 3.40** Дарожныя каўбоі.
**14.10, 1.00** Махінатары.
**16.00** Зніклае золата.
**17.00** Залатая ліхаманка.
**20.00** Заваёўванне новых земель.
**21.00** Аляска: апошняя мяжа.
**22.00** На краі Аляскі.
**0.00, 2.50** Гульні ў ламбардзе.
**2.00** Маланкавыя катастрофы.
**2.25** Сапраўдныя аферысты.

■ 9 фактаў пра...

# Бурдж-Халіфу

**Бурдж-Халіфа — адкрыты ў студзені 2010 года самы высокі хмарачос у Дубаі і наогул у свеце. Па форме будынак, агульны кошт якога ацэньваецца ў 4,1 мільярда долараў, нагадвае сталагміт, які нібыта расце з зямлі ў неба.**



**1.** Вышыня Бурдж-Халіфы складае 828 метраў, у той час як вышыня другога па велічыні будынка ў свеце (Шанхайскай вежы) складае 632 метры. Таксама хмарачос у тры разы вышэй за Эйфелеву вежу. Дызайн Бурдж-Халіфы быў натхнёны гіменакалісам — кветкай з доўгімі пялёсткамі, што разбягаюцца ад цэнтра. Тры крылы Бурдж-Халіфы разыходзяцца ў бакі, нібыта гэтыя пялёсткі.

**2.** Самая вышынная назіральная пляцоўка тут знаходзіцца на вышыні 452 метры. Усяго ў будынку 164 паверхі, 1 з якіх падземны, і цэлых 58 ліфтаў, што рухаюцца з хуткасцю 10 метраў у секунду (гэта адны з самых хуткіх ліфтаў у свеце). Таксама ў Бурдж-Халіфе ёсць 2957 паркавачных месцаў, 304 гасцініцы і 904 кватэры.

**3.** Першапачатковая назва хмарачоса — Бурдж-Дубай; яго праект быў распрацаваны амерыканскай фірмай Skidmore, Owings and Merrill. Інжынеры з Чыкага стварылі спецыяльную апорную структуру, якая нагадвае зорку з трыма прамянямі.

**4.** Бурдж-Халіфа — рэкардсмен па некалькіх паказчыках вышыні. Гэта самы высокі ў свеце будынак, які свабодна стаіць, з самым высокім жылым паверхам, будынак з найбольшай колькасцю паверхаў, будынак, абсталяваны самымі вышыннымі ліфтамі і другой па вышыні назіральнай пляцоўкай (самая высока размешчаная назіральная пляцоўка знаходзіцца ў кантонскай тэлевежы).

**5.** Для таго, каб пабудаваць настолькі гіганцкі хмарачос, спатрэбілася сапраўды шмат часу і намаганняў, а менавіта 6 гадоў і 22 мільёны чалавека-гадзін працы. У асабліва напружаныя дні на будпляцоўцы знаходзілася больш за 12 000 рабочых!

**6.** Для будаўніцтва спатрэбілася таксама неверагодная колькасць матэрыялаў. Аднаго алюмінію пайшло столькі, што хапіла б на вытворчасць 5 аэробусаў A380. Таксама было выдаткавана 55 тысяч тон арматурнай сталі і 110 тысяч тон бетону. Уявіце: калі б можна было скласці арматуру з будынка ў шэраг, то ён працягнуўся б на чвэрць Зямлі.

**7.** У Дубаі вельмі спякотна: летам сярэдняя тэмпература тут складае 41 градус. Менавіта таму больш за 300 нанятых кітайскіх экспертаў распрацавалі спецыяльную сістэму абліцоўвання, здольную абараніць ад экстрэмальных перападаў тэмпературы.

**8.** Для забеспячэння жыццядзейнасці ў такім вялізным будынку патрабуецца ўражлівая колькасць рэсурсаў. Да прыкладу, Бурдж-Халіфа выкарыстоўвае каля 950 000 літраў вады кожны дзень! Акрамя таго, хмарачос спажывае прыкладна столькі электраэнергіі, колькі «з'ядаюць» 360 000 ставатных лямпачак.

**9.** Як падтрымліваюць бляск і чысціню 26 000 шкляных панэляў, каб тыя выглядалі ідэальна? За гэта адказваюць 12 машын, якія важаць каля 13 тон кожная — яны перамяшчаюцца ўздоўж спецыяльных рэек на вонкавым баку будынка. Абслугоўваюць гэтыя машыны 36 чалавек

## Нядзеля, 24 студзеня

### Беларусь 1

**7.20 Серыял «Нахабніца».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50 Серыял «Выпадковыя знаёмыя».**
**17.35 Меладрама «Не сыходзь».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55 Меладрама «Каханне па раскладзе».**

### Беларусь 2

**6.55 М/с «Сябры анёлаў».**
**7.50, 20.05** Тэлебарометр.
**7.55, 18.05** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**8.25 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**10.15** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.20** Ваша лата.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.20** «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.50, 14.55 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**13.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстафета. Жанчыны.
**16.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстафета. Мужчыны.
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.

**21.10** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.25 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 21.55 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.35** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Гурт «Рэ-мажор», Дзмітрый Усцінаў, Паша Грын.
**10.15** «Наперад у мінулае».
**10.45** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**11.40** «Музеі Беларусі». Музей народнай архітэктуры і побыту.
**12.10** «Нарадзіўся я літвінам». Дак. фільм.
**13.00 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Скарбы Агры».**
**15.25** «Гітара па крузе». Музыканты Ігар Іваноў-Запольскі і Аляксей Селязнёў.
**16.25 «Сухадол». Драма.**



**17.55 «Імпульс Алфёрава». Фільм першы «Сем дзён аднаго года».**
**18.50 «9 дзён аднаго года». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Рознымі шляхамі. Жыццё пасля «Бітлз». Дак. фільм.
**23.25** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Пётр Сталыпін. Стрэл у антракце». Дак. фільм.

### Беларусь 5

**7.00, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**7.10** Індархакей. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Беларусь — Аўстрыя.
**8.10** Баскетбол. НБА. «Кліўленд» — «Чыкага».
**9.55, 11.05** Індархакей. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матчы за месцы з 5-га па 8-е.
**12.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Жанчыны.
**12.55** Індархакей. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
**13.55** «Спорт, спорт, спорт». Веніямін Арзамасцаў.
**14.25** Індархакей. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
**15.25** Авертайм.
**15.55** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «УНІКС».
**17.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Эстафета. Жанчыны.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Чэлсі».
**20.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Эстафета. Мужчыны.
**22.35** На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**23.05** Фактар сілы.
**23.30** Баскетбол. НБА. «Х'юстан» — «Далас».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Уладзімір Высоцкі. Я прыйду па вашы душы».
**12.15 Маст. фільм «Гаспадар тайгі».**
**13.50** «Ералаш».
**14.20 Маст. фільм «Пасвячоны».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Кропля ў кроплю». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** Да дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».

**22.50 Меладрама «Мідлтон».**

### СТБ

**6.05 Драма «Правілы вінаробаў».**
**8.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.30, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.55 Фільм — дзецям «Пітэр Пэн». 2-я серыя.**
**10.10** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 8». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 23.25 Камедыя «Пакроўскія вароты».**
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «На раздарожжы».**
**22.10** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15, 8.35** М/ф.
**6.30 Маст. фільм «Золатавалоска».**
**8.05** «Нітка да ніткі».
**9.00** «Рэальнае ўсынаўленне».
**9.30, 5.25** «Чаму я?»
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Трэш-тэст».
**10.45 Серыял «Час для дваіх».**
**14.20 Маст. фільм «Дарослая дачка, або Тэст на...».**
**16.15, 22.30 Серыял «Паласа адчужэння».**
**21.00** «Разам».
**0.15 Серыял «Маша ў законе».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Сродак ад расстання».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.30** «Ранішняя пошта».
**13.05, 14.15 Камедыя «Хачу замуж».**
**15.10, 21.50 Маст. фільм «Толькі пра каханне».**
**20.00** Весткі тыдня.
**23.40** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Хвост».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**14.20** «Паедзем, паядзім!»
**15.05, 16.20 Серыял «Двое з пісталетамі».**
**18.00** «Следства вялі...»
**19.00** «Акцэнты тыдня».
**20.00 Маст. фільм «Плата па лічыльніку».**
**23.15** «Судовы дэтэктыў».

### 8 канал

**9.00, 14.55, 19.00, 23.35** «Надвор'е».
**9.05, 15.00** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 14.45, 15.45, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45** «Мой любімы гадаванец».
**11.15 «Сінематограф». Маст. фільм «Жаданне».**
**12.45 Трылер «Ідэнтыфікацыя Борна».**
**16.15 Серыял «Каломба».**
**18.00** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05 Трылер «Прафесіянал».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Не злоўлены не злодзей».**

### ВТБ

**6.00, 23.20, 1.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 16.30, 1.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 16.00** «Ералаш».
**9.00** «Вялікая маленькая зорка».
**10.00, 3.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**14.00, 19.30** «Уральскія пельмені».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**17.00** Баявік «Рэд 2».
**21.00** Прыгоды «Падарожжа на Кон-Цікі».
**0.30** Скетчком «Студэнты».
**2.00** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».
**2.30** «Дурні і дарогі».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Мара». Маст. фільм.
**12.15** «Легенды сусветнага кіно». Міхаіл Ром.
**12.45** «Расія, любоў мая!» «Сібірскія самаходы».
**13.10** «Хто там...»
**13.40** «Жывая Арктыка. Ісландыя. Краіна агню і лёду». Дак. фільм.
**14.35** «Што рабіць?»
**15.20** «Пешшу...» Масква Савы Марозава.
**15.50** «Пласіда Дамінга. Мае лепшыя ролі». Дак. фільм.
**17.05** «Тры суперзоркі ў Берліне. Ганна Нятрэбка, Пласіда Дамінга, Раланда Віланзон».
**19.10** Геніі і ліхадзеі. Міхаіл Цвет.
**19.40, 1.55** «Шукальнікі». «Дуэль без прычыны».
**20.25** Год кіно-2016. «Родная кроў». Маст. фільм. «Ля сцен Малапагі». Маст. фільм.
**23.30** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». «Тоска». Опера Джакома Пучыні. Пастаноўка тэатра «Кавент-Гардэн».
**1.50** «Маруднае бістро». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Лепшае. 2009 год.
**6.40, 8.05, 9.40, 11.00, 12.35, 13.10, 14.45, 17.25, 18.45, 20.15, 21.25, 23.15, 0.30, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Кампаньерас».
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**12.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1993 год.
**13.00** Дак. фільм «БГ».
**13.40** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Куды ён дзенецца!».
**18.00** «Акулы пяра». Лайма Вайкуле. 1998 год.
**19.00** «Зямля-Паветра». Група «Жукі». 2003 год.
**21.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Аркадзь Райкін.
**22.00** Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...».
**0.00** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год. Канцэрт групы «Ліга блюзу» ў тэатры Эстрады.
**1.00** Маст. фільм «Чырвоныя дыпкур'еры».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EuroSport 1

**2.05, 18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**2.30, 16.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**3.00, 5.00, 9.00, 12.45, 23.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Australian Open.
**12.30, 22.00, 1.05** Тэніс.
**16.30, 20.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**19.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**21.00, 0.00** Зімовыя віды спорту.

### Камедыя

**0.35, 17.40** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».



**2.30, 19.40** Камедыя «Няма сексу — няма грошай».
**4.10, 21.30** Камедыя «Модная штучка».
**5.50, 23.10** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**7.25** Камедыя «Віктар».
**9.00** Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
**10.40** Камедыя «Два ў адным».
**12.10** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі».
**14.00** Камедыя «Высакародны венецыянец».
**15.45, 17.20** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «М+Ж».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.30** «Дачныя гісторыі».
**9.55, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.50** «Паненка і кулінар».
**11.25, 0.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**14.55** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.20** «Пацук». Меладрама.
**19.40** «Без падману».
**20.30** «Двухсотгадовы чалавек». Фантастыка.
**22.55** «Асцярожна, махляры!»
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.55** «Міністэрства аховы здароўя папярэджвае». Дак. фільм.

### ТБ1000

**7.30** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**9.15** Меладрама «Розум і пачуцці».
**11.30** Прыгоды «Пітэр Пэн».
**13.20** Фантастыка «Прысвечаны».
**15.00** Меладрама «Вечнае ззянне чыстага розуму».
**16.50** Камедыя «Бі і крычы».
**18.30** Драма «Перш чым я засну».
**20.00** Меладрама «Якія не спяць у Сіэтле».
**21.50** Меладрама «Жонка вандроўніка ў часе».
**23.40** Трылер «Улада страху».
**1.40** Меладрама «Іспанская-англійская».
**4.00** Трылер «8 міліметраў».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Сава Марозаў».
**8.10** Камедыя «Дэжа вю».
**10.05** Меладрама «Федзька».
**11.35** Камедыя «Ёлкі лахматыя».
**13.05** Маст. фільм «Вечары на хутары каля Дзіканькі».
**14.20** Драма «Люстэркі».
**16.40** Драма «Чыстая перамога».
**18.40** Камедыя «Мама дарагая!».
**20.20** Меладрама «Іронія кахання».
**22.05** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
**23.40** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**1.20** Камедыя «Ёлкі 3».
**3.00** Камедыя «Ёлкі 1914».
**4.50** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».

### National Geographic

**6.00, 13.20** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 12.35** Гульні розуму.
**7.35, 11.50, 17.10, 23.15, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата горада-прывіда.
**8.45** Прарыў.
**9.30** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**10.20** Космас.
**11.00** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**14.10** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.50** Дзікая прырода Амерыкі.
**15.40** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.25** Стафардшырскі скарб.
**18.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**21.00, 0.00, 3.45** Рэстрэпа. Аванпост у Афганістане.
**21.45, 0.45, 4.30** Крытычная сітуацыя.

### Discovery

**6.00, 15.05, 3.40** Паляўнічыя на зброю.
**6.50, 2.50** На краі Аляскі.
**7.45, 2.00** Голыя і напалоханыя.
**8.40** Бітва з акіянам.
**9.35** Выжыць разам.
**10.30, 18.00** Залатая ліхаманка.
**12.20, 20.00** Загадкі планеты Зямля.
**13.15, 21.00** Космас навыварат.
**14.10, 22.00** Як уладкаваны Сусвет.
**23.00** Аляска: апошняя мяжа.
**0.00** Хуткія і гучныя.
**1.00** Паляўнічыя на старызну.

# ХРАМ ТАЛЕНТАЎ

## Сёння споўнілася б 80 гадоў Янку Сіпакову



Звычайна, калі ён прыходзіў да нас у рэдакцыю часопіса «Гаспадыня», то найперш зазіраў у мой кабінет і далікатна пытаўся:

— Не вельмі заняты?

Здаралася, што я сапраўды быў заняты якой-небудзь пільнай справай (вычытка матэрыялаў, здача нумара ў друк), і даводзілася пераносіць сустрэчу на пазней. Але часцей за ўсё, адклаўшы надакучлівыя паперы, я запрашаў Івана Данілавіча сядаць бліжэй, і ў нас пачыналася нязмушаная, шчырая, без аглядкі на час гаворка.

Найбліжэйшае і самае балючае, пра што хацелася пагаварыць, абмяняцца думкамі, — стан нашай сённяшняй літаратуры, і асабліва маладой. Толькі абыякавы да ўсяго мог не бачыць, што нямала хто з маладых і, што асабліва крыўдна, таленавітых празаікаў, паэтаў выведзены з сапраўднай літаратуры і творчасць іх скіравана, як казаў класік, «мімо жызні».

Праблема гэтая, безумоўна, даўняя. Пра яе ў свой час пісаў са здзеклівай іроніяй Янка Брыль: «Во, і яшчэ адзін пнецца быць вельмі сучасным, усё ў яго «аповедзе» на адных намёках, на глыбакадумным недагаворванні... А я, прачытаўшы цярпліва, амаль пазяхнуў: не хапала яшчэ здагадваццa, што тут у цябе да чаго!»

Эксперымент, творчы пошук — гэта добра, гэта нават патрэбна на пачатку літаратурнай дарогі, даводзіў Іван Данілавіч, але калі эксперымент зацягваецца надоўга, то гэта не на карысць ні аўтару, ні літаратуры.

Колькі мы пра гэта гаварылі з Янкам Сіпаковым! Не раз і не два, калі размова заходзіла пра сённяшнюю літаратуру, Іван Данілавіч скрушна заўважаў: «...наша пакаленне ўсур'ёз, з найвялікшай пашанай ставілася да слова, да літаратуры. Гэта быў для нас храм, у які мы ўваходзілі асцярожна, сцішана і ніякавата, узнёсла — як маліцца...»

Так, Янка Сіпакоў — высокі і магутны талент, які, на маю думку, і да гэтага часу па-сапраўднаму не ацэнены і як след не асэнсаваны ні нашай крытыкай, ні нашай грамадскасцю. Хаця ён у сорак гадоў ужо меў Дзяржаўную прэмію, а крыху пазней быў уганараваны і званнем заслужанага дзеяча культуры. Але ж справа не ва ўзнагародах. Справа ў вызначанні ролі і месца пісьменніка ў нашай літаратуры. І не толькі нашай, а можна браць і шырэй — ва ўсім славянскім свеце. Бо яго кніга «Вечаславянскіх балад» — геніяльнае слова пра нашых братоў-суседзяў, пра нашу агульную гісторыю.

Аднак талент — гэта толькі паўсправы. А што патрабуецца яшчэ для таго, каб стаць пісьменнікам? Аднойчы такое наіўнае пытанне я задаў Івану Данілавічу. І ён надзвычай сур'ёзна адказаў: адукацыя, веданне жыцця, працавітасць і цярпенне.

Усімі гэтымі якасцямі Сіпакоў валодаў у поўнай меры. Вучыўся ўсё сваё жыццё. Меў адну з самых багатых бібліятэк у Мінску. Ганарыўся тым, што сваю самую запаветную кнігу «Зялёны лісток на планеце Зямля» — своеасаблівую энцыклапедыю пра Беларусь і беларусаў — напісаў, не выходзячы з дому, уся неабходная літаратура знайшлася ў хатняй бібліятэцы.

Здзіўляў глыбокім веданнем жыцця. Па-першае, да сямнаццаці гадоў жыў у вёсцы і як круглы сірата рана спазнаў усе радасці і турботы сялянскага жыцця: і касіў, і араў, і кароў пасвіў, і дровы нарыхтоўваў... Пазней, ужо маладым пісьменнікам, з пуцёўкай літфонду аб'ехаў як не ўвесь Савецкі Саюз.

А ўжо пра сіпакоўскую працавітасць і цярпенне хадзілі легенды. Ды і сам ён прызнаваўся: «Я — працаголік, і таму ўсоды толькі шчыра і настойліва працаваў... Я шчаслівы, што ў мяне выйшла 55 кніжак паэзіі, прозы, эсэ, перакладаў. Неяк і сам не разумею, як гэта атрымлівалася, аднак на мяне і маю творчасць мала ўплывала змена эпох, лідараў, фарматаў. Я, не зважаючы на іх, пісаў толькі тое, што хацелася». Пісаў, дарэчы, кожны дзень. Ад цямна і да цямна, а нярэдка прыхопліваючы яшчэ і ноч. І не стамляўся. Стамляўся, калі не працаваў.

Гаворачы пра Янку Сіпакова, нельга не сказаць пра яго як пра выдатнага майстра. Майстра слова, майстра сюжэта, майстра самых розных літаратурных жанраў. Такую разнастайнасць жанраў, як у Сіпакова, рэдка ў каго можна знайсці. У паэзіі — гэта санет, вянок санетаў, балада, тэрцына, буколіка, верлібр, трыялет, эпіталама, паэма ў прозе. У прозе — апавяданне, эсэ, аповесць, прытча, навела, мініяцюра, нарыс, фантастыка. І нават у рамках аднаго жанру ён пазбягаў паўтарэння, аднастайнасці. Скажам, тая ж прытча ў яго своеасаблівая. Яна не заўсёды кананічная. Шукаў і знаходзіў у ёй нейкі свой пяты вугал, нейкае невядомае вымярэнне. Таму і атрымоўваліся то прытча-аповесць, то прытча-навела, то прытча-апавяданне, то нават прытча-метафара.

І ўсё ж з усіх складнікаў майстэрства пісьменніка найперш — сэрца, не раз падкрэсліваў Янка Сіпакоў. «Удзельнічае сэрца ў творчым працэсе — у творы будзе ўсё: і мова, і стыль, і сэнс. Яно — пачатак усялякай творчасці, яно — пачатак хвалявання, без якога не можа нарадзіцца ніводзін сапраўдны твор».

Праз сваё чуйнае, мудрае, спагадлівае сэрца Іван Данілавіч прапускаў не толькі кожны свой радок, але і адносіны да людзей. Так, ён сапраўды адчуваў сябе шчаслівым таму, што за ўсё сваё жыццё нікога, нідзе, ніколі не пакрыўдзіў і не абразіў. Але гэта не значыць, што яго можна назваць усёдаравальным. Не, калі справа тычылася рэчаў важных, дарагіх для яго, асабліва ў літаратуры, Іван Данілавіч праяўляў і цвёрдасць, і прынцыповасць.

...Ён яшчэ гарэў творчымі задумамі, будаваў планы на летні адпачынак, марыў пра восенькі важ у грыбы... Чалавек паўнакроўна, без усялякай аглядкі і трывогі жыў, а недзе там, у горных высях, ужо быў вызначаны той апошні, незваротны рубеж, да якога яго ўжо клапатліва рыхтавалі, няўхільна вялі.

Інакш чым можна растлумачыць тое містычна-фантастычнае, што адбывалася з Янкам Сіпаковым апошнім часам?

На працягу аднаго года выйшла адразу чатыры кнігі. Ды не абы-якія — знакавыя! «Выбранае» ў серыі «Школьная бібліятэка», раман «Зубрэвіцкая сага», эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля», зборнік «Маладыя вецер. Мужчынскія апавяданні».

Не выдаваўся гадамі, а тут раптам нейкі кніжны феерверк, святочны салют. Фантастыка!

А як расцаніць такі факт? Недзе неўзабаве пасля юбілею (15 студзеня 2011 г. Янку Сіпакову споўнілася 75 гадоў) яго запрасілі ў госці землякі-аршанцы. Нагода нешараговая: у Аршанскай гарадской бібліятэцы імя Пушкіна адкрывалася чытальная зала Янкі Сіпакова. Я ведаў: пра гэту падзею размова вялася ўжо цэлы год. Іван Данілавіч перадаў нават для пачатку некалькі тысяч тамоў з уласнага кнігазбору. А ўсяго збіраўся перадаць у персанальную залу каля 15 тысяч кніг, сярод якіх шмат каштоўных, часам вельмі рэдкіх, сапраўдных рарытэтаў.

Але афіцыйнага рашэння ўсё не было, і справа замарудзілася — не так, аказваецца, усё гэта проста. І вось нарэшце дакумент падпісаны. Трэба ехаць на адкрыццё. Праўда, адкрыццё пакуль сімвалічнае, таму што сама зала яшчэ рамантуецца і адчыніцца крыху пазней.

Аднак гэта ніколечкі не змяншыла значнасці падзеі і радасці Івана Данілавіча. Хоць ён разам з тым і вагаўся: ехаць — не ехаць? Не так палохала далёкая дарога, як сур'ёзная псіхалагічна-эмацыянальная нагрузка. Ці вытрымае гэты стрэс яго хворае сэрца? Дый не прывык ён да такіх афіцыйна-ўрачыстых мерапрыемстваў.

— Вось калі б ты, мой дружа, паехаў разам са мною, — нясмела папрасіў ён, — мне было б і весялей, і надзейней.

— Якая размова! — абрадаваўся я прапанове. — Канечне, едзем. Заадно пабываем у тваіх родных Зубрэвічах.

І была гэтая паездка. І была цёплая, шчырая сустрэча з чытачамі — спачатку ў раённай, а пасля і ў гарадской бібліятэцы імя Якуба Коласа. І было прачулае, сардэчнае віншаванне аршанцаў свайго знакамітага земляка з юбілеем.

Толькі позна ўвечары мы дабраліся ў родныя Зубрэвічы. На дварэ ўжо стаяла цемень, тым не менш ад экскурсіі па вёсцы Іван Данілавіч не адмовіўся. З якой замілаванасцю расказваў ён нам (а з намі быў яшчэ адзін аршанец — пісьменнік Павел Саковіч) пра гісторыю кожнай хаты, пра лёс кожнага жыхара, з якой настальгічнай тугою прыгадваў сваё сірочае маленства (бацькоў фашысты расстралялі за сувязь з партызанамі), бядотнае, але разам з тым і шчаслівае юнацтва — паступў ва ўніверсітэт, вучыўся на журналіста.

А ў гасціннай хаце пляменніцы Тамары за шчодрым сталом мы засядзеліся ледзь не да паўночы. Вяртаўся назад Іван Данілавіч расчулены і шчаслівы:

— Ніколі яшчэ я не меў гэтулькі дабрыні і любові, як сёння... Дзеля гэтага варта было жыць і працаваць.

Апошняй фразе тады я не надаў асаблівага значэння — так часта кажуць. Цяпер жа мне чуецца ў ёй нейкі містычны падтэкст. Няўжо Янка ўжо нешта прадчуваў?

**«Удзельнічае сэрца ў творчым працэсе — у творы будзе ўсё: і мова, і стыль, і сэнс. Яно — пачатак усялякай творчасці, яно — пачатак хвалявання, без якога не можа нарадзіцца ніводзін сапраўдны твор».**

Напэўна, прадчуваў. Бо калі я праз два дні зайшоў да яго ў бальніцу, ён сядзеў на ложку незвычайна сумны, тужлівы, разгублены.

— Мусіць, прыйшла ўжо мая пара...

Гэта было сказана з такой скрухаю, з такім болем, што ў мяне пахаладзела пад сэрцам. Я пачаў сварыцца, каб ён выкінуў гэтыя дурныя думкі з галавы, а ён, нібы не чуючы мяне, паўтарыў:

— Мусіць, я ўжо, дружа мой, не выканаю твой наказ... не дапішу «Маю бібліятэку»...

Праз месяц Янкі Сіпакова не стала. Не стала майго лепшага, майго шчырага і вернага сябра, з якім мы сумесна ішлі пакручастымі жыццёвымі сцежкамі больш за трыццаць гадоў. Не стала клапатлівага сямейніка, які так любіў свайго адзінага сына Сяргея, так кранальна апекаваўся сваёй красуняй унучкай Кацяй. Не стала вялікага грамадзяніна-патрыёта, які так аддана любіў і шанаваў родную бацькоўскую зямлю, з такім болем і трывогаю перажываў за лёс матчынай мовы.

Не стала выдатнага пісьменніка, класіка беларускай літаратуры. На шчасце, ён выканаў галоўную творчую місію, дзеля якой, можа, і прыходзіў у гэты свет — напісаў унікальную трылогію: раман «Зубрэвіцкая сага» — гімн сваёй малой радзіме, эсэ-аповесць «Зялёны лісток на планеце Зямля» — гімн «любай, неагляднай Беларусі» і «Веча славянскіх балад» — гімн усяму славянству. Нават калі б ён не напісаў больш нічога (а ён напісаў яшчэ шмат выдатных твораў), то і гэтага было б дастаткова, каб імя яго назаўсёды засталося ў нашым прыгожым пісьменстве.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

---

■ Неасабісты суб'ектыў



# ТЭСТ НА САПРАЎДНАСЦЬ

## Яе вялікасць Сітуацыя абавязкова здарыцца і правядзе яго з кожным

Яно так звычайна і бывае: жывеш сабе спакойна і побач жывуць людзі. Адны проста знаёмыя, другіх ты лічыш прыяцелямі, трэціх — як правіла, зусім нямногіх, ты адносіш да катэгорыі сяброў і блізкіх. А потым здараецца нешта неардынарнае — і ты агаломшаны са здзіўленнем назіраеш, як чужыя становяцца спрычыненымі да тваёй ці агульнай праблемы больш, чым прыяцелі і самыя блізкія. Тады і пачынаеш разумець, што ўсе чалавечыя адносіны, усе пачуцці, нават такія неабходныя кожнаму, як давер, сяброўства, каханне, дзеляцца на дзве катэгорыі: сапраўдныя і несапраўдныя. Менавіта так, і ніякай сярэдзіны, і ніякага «амаль» тут няма. Яе вялікасць Сітуацыя абавязкова здарыцца і правядзе тэст на сапраўднасць. І дыягназ будзе бясспрэчны і без права на перагляд.

А сітуацый у гэтым жыцці шмат, іх толькі разгледзець трэба. Вось, напрыклад, гэта мокра-снежная «Даніэла», што прайшлася завірухай па ўсёй краіне. Транспарт у Мінску хадзіў — самі бачылі як. І вось — Сітуацыя. Тралейбус, што вёз людзей у напрамку метро, доўгі такі, гармонікам, бездапаможна спыніўся на невялікім пад'ёме. Вадзіцель, маладая невысокая жанчынка, роспачна развяла рукамі, абышоўшы кругом, і адчыніла дзверы: выходзьце, маўляў. Пасажыры пачалі скакаць у снег, кіроўцы машын, якія трапілі ў затор, у лепшым выпадку маўчалі. Бедная «гаспадыня» тралейбуса ад разлаваных мужыкоў чаго толькі пра сябе не пачула. Яна стаяла ля сваёй згорбленай машыны з вінаватым выглядам, нібы ўласнаручна закруціла ўсю гэту завіруху.

І тут з'явіўся таксіст. Зусім незнаёмы, выпадковы спадарожнік таго няшчаснага тралейбуса — ехаў па суседняй паласе і мог абсалютна спакойна працягваць свой шлях. Але ён выскачыў са свайго аўто і загадаў пасажырам тралейбуса вярнуцца ў салон. «Так, а цяпер усе сталі па цэнтры, дзе «гармонік», — ён гаварыў гэта з такой упэўненай сілай, што аслухацца было немагчыма. — А мужыкі — за мной: будзем штурхаць». І здарылася дзіва. Непаслухмяная машына натужна загула і — скранулася з месца. Пасажыры аж у ладкі запляскалі — нібы на самалёце ўдала прызямліліся. Усе хацелі падзякаваць нечаканаму выратавальніку, але ён махнуў рукой, кінуў штосьці кшталту «усе людзі — браты» і паехаў. Пэўна, спазніўся на выклік. Ці ўвогуле прапусціў. Страціў грошы, якія мог зарабіць. Дзеля таго, каб сорак чалавек не спазніліся на працу. Дзеля таго, каб прывабны жаночы твар, нават ніколі да гэтага не бачаны, не псаваў выраз роспачы і вінаватасці. Варта было? Па яго ўласным кодэксе гонару — варта.

Аўвечары пазваніў знаёмы, іншую гісторыю расказаў. Таксама Сітуацыя. Яму ў гэткую непагадзь давялося па неадкладных справах на сваім аўто ў райцэнтр ехаць, да якога кіламетраў трыццаць. Дарогу пачысцілі, але пад вечар зноў замяло, вялікай патрэбы зноў чысціць участак да іхняга пасёлка не было: рэйсавы аўтобус, хлебная ды паштовая машыны праехалі. Карацей, наш запознены герой на сваёй таёце ў гурбе кіламетры за тры ад роднай хаты і засеў. Добра, мабільны з сабой быў, пачаў ён суседу, у якога трактар свой, званіць. Прычым не проста суседу — сябру, з якім і на касьбу, і на рыбалку, і на ўсе святы разам — ды во, пару дзён назад Каляды спраўлялі ў адной хаце. На трактары — што там тую машыну за трос тузануць, дый ехаць — дзесяць хвілін. Сусед выручыў — прыехаў, выцягнуў. За пяцьсот тысяч беларускіх рублёў. Таксу абгаварыў адразу і толькі атрымаўшы згоду (не адразу — мой знаёмы хвілін колькі не мог сам сябе пераканаць, што «сябар» не жартуе), прыехаў. Грошы ўзяў спакойна, пералічыў, радасна кінуў: «Ну што, да заўтра». Тэст пройдзены. Вердыкт — вынесены. «Я з ім пасля гэтага толькі вітацца буду, — знаёмы, здаецца, дагэтуль у стане лёгкага шоку. — Але ці зразумее ён, чаму?» Мне падаецца, наўрад ці.

Зіма ўвогуле падобныя Сітуацыі падкідвае часта. Не смяротна небяспечныя, але вельмі паказальныя, якія адразу падказваюць, хто ёсць хто, дзе сапраўднае, а дзе — фальшыўка. Зімой мы і нашы блізкія часцей хварэем, і адразу відаць, хто патэлефануе, хто адчыніць у хату дзверы, а каму абсалютна ўсё роўна, што ў цябе адбываецца. Зімой здараюцца такія вось завірухі і моцныя маразы, і тэст на сапраўднасць зноў спрацоўвае. Вясковыя людзі, якія жывуць у цеснай суполцы, гэта калі не ведаюць, дык адчуваюць дакладна. Таму там і сёння да кожнай хаты, дзе ёсць чалавек, пасля завеі пратаптаная сцежка — гэткі знак на снезе, што побач жывуць тыя, каму не ўсё роўна.

Неяк у другім класе, ідучы ў школу, мы з сяброўкай наладзілі скачкі ў снег — на старой глыбокай дарозе яго было намецена метры два. Была адліга, і ваша пакорная слуга, ускочыўшы амаль па пояс у рыхлую белую кашу, выбрацца ўжо не змагла. Чым больш я круцілася, спрабуючы выкараскацца, тым больш снег вакол падтаваў і тут жа замярзаў, і я праз колькі хвілін была ўжо ў сапраўдным ледзяным палоне, які нашы тонкія пальчыкі нават парушыць не маглі... Светка з лямантам панеслася клікаць на дапамогу маю бабулю (былі мы за вёскай, да нашай хаты — добры кіламетр). Мароз мацнеў, лёд вакол ног цвярдзеў. Бабулі было амаль восемдзесят...

Мяне выратавалі зусім чужыя людзі — цётка Кадлубовічыха і бабуля Сеўручыха, яны жылі бліжэй за ўсіх ад той дарогі. Я памятаю, як яны беглі — на хаду завязваючы хусткі, у незашпіленых бурках. Як голымі чырвонымі рукамі дралі той зацвярдзелы снег, як хукалі на мае змерзлыя пальцы, як шапталі: «Не плач, Алёнка, не плач, зараз, зараз»...

Мінула больш за трыццаць гадоў, бабулі Сеўручыхі ўжо даўно няма ў жывых, цётцы Ніне Кадлубовіч дай Бог здароўя і доўгіх год. Калі здараецца вось такая непагадзь ці іншая Сітуацыя, калі людзі, ад якіх як ад нікога, чакаеш спагады і дапамогі, раўнадушна праходзяць міма, я часта ўспамінаю той выпадак. Як жанчыны дралі голымі адубелымі рукамі той калючы шарпак, ратуючы малую дурніцу, якая ім нават і не суседка...

Тэст на сапраўднасць мы праходзім, часта нават не здагадваючыся пра гэта. Што з таго? Пасля будзе — па справах і ўчынках нашых. Я асабіста ў гэта веру.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by ■

## Извещение о проведении 28 января 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25 | 5 908 912 800 | 59 000 000 |
| 2. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 18 792 732 000 | 1 500 000 000 |
| 3. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 246 281 280 | 24 000 000 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.

**Организатор торгов:** УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 января 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.01.2016 по 26.01.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, ОАО «СтанкоГомель» 8(0232)75-71-11

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение с инв. №350/С-111683 (здание склада упаковщиков), общей площадью 164,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. №350/С-111643 (ремонтно-строительного и модельного цеха), общей площадью 1202,0 кв.м (составные части и принадлежности: пять пристроек и металлический навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. №350/С-111641 (пилорама), общей площадью 82,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-78236 (склад ГСМ), общей площадью 72,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111637 (склад цемента), общей площадью 263,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111636 (склады), общей площадью 73,3 кв.м (составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111639 (склад лакокрасок), общей площадью 266,7 кв.м (составные части и принадлежности: навес, металлические ворота, ж/б забор, кирпичный забор, ж/б забор, кирпичный забор, асфальтовое покрытие площадью 3976,0 кв.м), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10/17. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111638 (весовая), общей площадью 80,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-166018 (здание склада огнеупоров), общей площадью 190,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111642 (мойка автомашин), общей площадью 7,3 кв.м (составные части и принадлежности: эстакада с ёмкостями для сбора и отстоя сточных вод), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10/23. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000001005894 площадью 0,8294 га | 8 609 112 000 | 860 911 200 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 25 января 2016 г. в рабочие дни с $9^{00}$ до $17^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **26 января 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствие с действующим законодательством и Положением Филиала «Центр «Белтехинвентаризация».

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

белагропромбанк
традиции будущего

# ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ) НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА) «@gro»

Настоящий документ, размещенный на официальном сайте Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»), именуемого в дальнейшем «Вкладополучатель» в сети Интернет по адресу: www.belapb.by, является предложением заключить договор срочного банковского вклада (депозита) «@gro» (далее – Договор) с физическим лицом, являющимся владельцем текущего (расчетного) банковского счета, к которому выпущена банковская платежная карточка (далее – текущий счет с БПК), зарегистрированная на имя физического лица и подключенная к подсистеме «Частный клиент» системы дистанционного банковского обслуживания «ДБО BS-Client» (система Интернет-банкинг) (далее – система Интернет-банкинг), в дальнейшем именуемым «Вкладчик».

Вкладополучатель считает себя заключившим Договор на условиях, указанных в настоящем предложении, с Вкладчиком, который при соблюдении условий настоящей оферты отзовется на настоящее предложение (акцептует предложение).

Акцептом публичной оферты является совершение Вкладчиком в системе Интернет-банкинг с использованием реквизитов банковской платежной карточки (далее – БПК) всех предусмотренных в системе Интернет-банкинг действий, необходимых для осуществления перевода суммы первоначального взноса с текущего счета с БПК на счет по учету вкладов (депозитов) (далее – вкладной (депозитный) счет).

Договор считается заключенным между Вкладополучателем и Вкладчиком в момент получения Вкладополучателем акцепта публичной оферты и поступления денежных средств на вкладной (депозитный) счет Вкладчика.

1. ПРЕДМЕТ ДОГОВОРА

1.1. Вкладчик в системе Интернет-банкинг с использованием реквизитов БПК перечисляет со своего текущего счета с БПК денежные средства в белорусских рублях на вкладной (депозитный) счет, а Вкладополучатель принимает их, обязуется обеспечить их сохранность, возвратить сумму вклада (депозита) и выплатить начисленные проценты по вкладу (депозиту) в безналичном порядке на условиях и в порядке, предусмотренным настоящим Договором.

1.2. Вид договора банковского вклада (депозита): срочный отзывный.

1.3. Сумма вклада (депозита) на дату внесения (перечисления) вклада (депозита):

| Сумма вклада (депозита) цифрами | Сумма вклада (депозита) прописью | Валюта вклада (депозита) |
|---|---|---|
| | | Белорусские рубли |

1.4. Минимальный размер суммы первоначального взноса во вклад (депозит) составляет 500 000 (Пятьсот тысяч) белорусских рублей.

1.5. Срок хранения денежных средств на вкладном (депозитном) счете составляет _____ (_______________________________) календарных дней с ___.___._____ по ___.___._____. Дата наступления срока возврата вклада (депозита): ___.___._____, с учетом условий, предусмотренных настоящим Договором, в том числе пунктом 1.6. настоящего Договора.

